тичности своего существования. В условиях, когда сотрудники все более полагаются на работу со знаниями на своих рабочих местах, лидеры должны использовать нетрадиционные и нешаблонные лидерские практики.


### Список использованных источников

1. Парадигма : в 5 т. / В. А. Сердюк [и др.]. – М. : ЛЕНАНД, 2019. – Т. 1 : Парадигма науки изначально Вышестоящего Отца. – 997 с.

2. *Лалу, Ф.* Открытая организация будущего / Ф. Лалу ; пер. с англ. В. Кулябиной. – М. : Манн, Иванов и Фербер, 2014. – 432 с.

3. *Бородина, В.* Нашествие гуманитариев: почему они теснят технарей в топ-менеджменте IT-компаний [Электронный ресурс] / В. Бородина. – Режим доступа: https://forbes.ru-nashestvie-gumanitariev-pochemu-oni-tesnyat-tehnarey-v-top-menedzhmente. – Дата доступа: 17.04.2019.

4. *Замулин, А. Л.* Лидерство в эпоху знаний / А. Л. Замулин // Вестн. СПбГУ. Сер. Менеджмент. – 2012. – Вып. 3. – С. 48–77.


УДК 800


**В. У. Лук’янец**

*Гімназія № 14 г. Мінска, Мінск, Беларусь, 2009lov@mail.ru*


## ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАМОЎНАГА САЦЫЯЛЬНА ЗНАЧНАГА АСЯРОДДЗЯ НА АСНОВЕ АРГАНІЗАВАНАЙ ПЕРАЕМНАСЦІ МАРШРУТАЎ ШМАТУЗРОЎНЕВАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ


*Фарміраванню камунікатыўных уменняў і навыкаў сучасных вучняў надаецца на сённяшні дзень вялікае значэнне: цяжка ўявіць паспяховага чалавека, творчую і актыўную асобу, схільную да самарэалізацыі і самавыражэння, маўленне якой вызначаецца беднасцю і аднастайнасцю моўных сродкаў, стылістычнай неўнармаванасцю. Разам з тым рэаліі XXI ст. дыктуюць свае правілы: усё часцей камунікацыя школьнікаў у рэчаіснасці саступае месца зносінам віртуальным. Гэта таксама накладвае свой адбітак на якасць маўлення падлеткаў, якое характарызуецца фрагментарнасцю, стыхійнасцю, недакладнасцю, ніверляваннем правіл пабудовы выказвання, аднатыпнасцю канструкцый, алагічнасцю і непаслядоўнасцю.*



***Ключавыя словы:*** *маўленчыя кампетэнцыі, грамадзянскасць, гісторыка-культурная спадчына*



**V. Lukyanets**

*Gymnasium № 14 of Minsk, Minsk, Belarus, 2009lov@mail.ru*


## FORMATION OF BELARUSIAN SOCIALLY SIGNIFICANT MEDIA BASED ON THE CONTINUITY OF ORGANIZED MULTI-LEVEL INTERACTION ROUTES


*Formation of communicative abilities and skills of today's students given so far of great importance: it is hard to imagine a successful person, creative and active personality, prone to self-realization and self-expression, it is determined by the poverty and monotony of language means, stylistic nevnarmavanastsyu. However, the realities of the XXI century dictate the rules: increasing communication students actually giving way to virtual communication. It also affects the quality of the speech of adolescents characterized by*

*fragmentation, spontaneity, inaccuracy, leveling rules for constructing speech, the same design, alagichnastsyu and inconsistency.*
***Keywords:*** *verbal competence, civic, historical and cultural heritage*

Выкарыстанне беларускай мовы на розных узроўнях зносін садзейнічае ўзбагачэнню слоўнікавага запасу, развіццю звязнага маўлення, творчага мыслення, фарміраванню даследчых кампетэнцый вучняў, якасна павышае ўзровень выхаванасці, абуджае нацыянальную самасвядомасць, любоў і павагу да роднай мовы, гісторыі, культуры, грамадзянскія і патрыятычныя пачуцці.

Родная мова – спецыфічны вучэбны прадмет. Спецыфіка яго заключаецца перш за ўсё ў тым, што гэта не толькі прадмет вывучэння, але сродак навучання, выхавання і сацыяльных зносін. У гэтым сэнсе беларуская мова з'яўляецца тым падмуркам, на які абапіраецца ўсё навучанне і выхаванне на ўзроўні агульнаадукацыйнай школы. Дзякуючы мове, вучні атрымліваюць навукова абгрунтаваныя звесткі пра навакольную рэчаіснасць. Праз мову яны паступова авалодваюць запасамі ведаў, якія назапашаны чалавецтвам за ўсю гісторыю яго развіцця. Родная мова такім чынам дапамагае дзецям не толькі вучыцца, але і сацыялізавацца ў грамадстве, пракладаць сцяжынкі да нацыянальнай бізнес-адукацыі.

Фарміраванню камунікатыўных уменняў і навыкаў сучасных вучняў надаецца на сённяшні дзень вялікае значэнне: цяжка ўявіць паспяховага чалавека, творчую і актыўную асобу, схільную да самарэалізацыі і самавыражэння, маўленне якой вызначаецца беднасцю і аднастайнасцю моўных сродкаў, стылістычнай неўнармаванасцю. Разам з тым, рэаліі XXI ст. дыктуюць свае правілы: усё часцей камунікацыя школьнікаў у рэчаіснасці саступае месца зносінам віртуальным. Гэта таксама накладвае свой адбітак на якасць маўлення падлеткаў, якое характарызуецца фрагментарнасцю, стыхійнасцю, недакладнасцю, нівеляваннем правіл пабудовы выказвання, аднатыпнасцю канструкцый, алагічнасцю і непаслядоўнасцю. Сярод прыярытэтаў айчыннай адукацыі большая набліжанасць да вытворчасці, бізнесу і стварэнне новай сістэмы «агульных ведаў» на беларускай мове. Шэраг сфер бізнесу адаптуюць беларускамоўныя накірункі (сервісы): абслугоўванне кліентаў на беларускай мове ва ўсіх дачыненнях кліент-бізнес. У інтэрнэт-краме кліентам прыдаецца беларускамоўная версія сайту і адпаведная тэлефонная падтрымка. Калі вы рамеснік ці індывідуальны прадпрымальнік, пажадана ўмець падтрымаць гаворку на беларускай мове на належным узроўні. Калі вы – фізічны бізнес як крама, кавярня ці рэстаран, сэрвіс-агенцтва з офісам, тады пажадана навучыць усіх супрацоўнікаў, якія працуюць з кліентамі, беларускай мове, ці выдзеліць адказнага супрацоўніка, каб забяспечыць кліенту магчымасць камунікацыі на беларускай мове. Такім чынам, беларускамоўны бізнес можа набыць значную канкурэнтную перавагу, каб адкрывалі новыя напрамкі, забяспечвалі і павялічвалі асяродак камфорту (экасістэму) для беларускамоўных спажыўцоў, сацыяльных партнёраў.

Пытанне фарміравання моўнага сацыяльна значнага асяроддзя адно з самых актуальных. Але гэта праблема мала распрацаваная ў літаратуры. Маюцца толькі асобныя артыкулы. Праблему разглядалі многія педагогі і псіхолагі: К. Д. Ушынскі, В. А. Сухамлінскі, Ж. У. Грынюк, А. А. Грымаць, Н. К. Катовіч, М. В. Жуковіч, У. М. Конан, В. М. Туркевіч і інш.

Такім чынам, агульнай асновай выхавання і навучання з'яўляецца авалоданне школьнікамі мовай, дзе дамінуючым аспектам павінна з'яўляцца мова родная. Наш праект прысвечаны вывучэнню ролі роднай мовы ў працэсе сацыялізацыі і станаўлення асобы вучня, на развіццё яго творчых здольнасцей.

На сучасным этапе развіцця грамадства выпускніку гімназіі недастаткова базавага прадметнага набору ведаў пра моўныя адзінкі, бо ў такім выпадку нівелюецца само прызначэнне працэсу навучання мове, якое заключаецца ў спрыянні фарміраванню камунікабельнай, актыўнай, творчай, здольнай да самаразвіцця, самаадукацыі і пазнання рэчаіснасці і працэсу сацыялізаванай асобы. Такім чынам, узнікаюць супярэчнасці паміж патрабаваннямі адукацыйнага стандарту да ўзроўню камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў.

Навучанне беларускай мове не павінна абмяжоўвацца фарміраваннем базавых уяўленняў пра мову, а таму галоўную ўвагу неабходна надаваць практычным уменням карыстання моўнымі сродкамі, навыкам аналізу, ацэнкі і ўдасканалення ўласнага маўлення, адаптаванага прымянення на практыцы ў сацыяльных зносінах. Таму гуманітарная адукацыя – гэта тое, што ўключае вывучэнне моўных заканамернасцяў здзяйсняецца не ізалявана ад маўлення, а на аснове сацыяльна значнай дзейнасці гімназіста, у якой прадугледжваецца прымяненне набытых камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Набыткі сучаснай педагогікі дазваляюць глыбока і абгрунтавана ставіцца да метадычнага суправаджэння педагагічнай дзейнасці настаўнікаў праз выкарыстанне такіх метадаў і прыёмаў, як тэарэтычны аналіз педагагічнай літаратуры; аналіз асноўных паняццяў і тэрмінаў даследавання; метад аналогій, пабудова гіпотэз і разумовага эксперыменту, прагназаванне, мадэляванне, што можа стаць дапаможным сродкам сучаснай бізнес-адукацыі.

Гісторыка-культурнае краязнаўства расчыняе перад дзецьмі гісторыю, асаблівасці культуры, прыроды, народных традыцый малой радзімы, прывівае іх да каштоўнасцей роднага краю праз захаванне моўных традыцый.

Вывучэнне малой радзімы, яе гісторыі, культурных традыцый, сучасных дасягненняў – працэс вельмі займальны для школьнікаў, ён адкрывае вялікія магчымасці для рэалізацыі творчых праектаў, экскурсій, сустрэч. Але гэта толькі з аднаго боку. З іншага, – звычайна на ўрокі краязнаўчага характару застаецца мінімум вучэбнага часу. Каб ліквідаваць гэтую супярэчнасць, актыўна прапагандуецца пазітыўны вопыт сумеснага сямейнага і гімназічнага выхавання.

Удзельнікі праекта, педагогі гімназіі № 14 г. Мінска могуць не толькі прапанаваць педагагічнай супольнасці дыдактычнае і метадычнае забеспячэнне па фарміраванні даследчай кампетэнтнасці вучняў, а таксама раскрыць традыцыйныя падыходы ў захаванні культурнай спадчыны, якія гарманічна спалучаюцца з інавацыйнымі мадэлямі навучання і выхавання.

Лічым, што гэты праект можа стаць універсальным на тэрыторыі Беларусі. Ведаць свой род, сваю гісторыю, мову – гэта абавязак кожнага свядомага беларуса. Але веды па гісторыі свайго роднага краю – гэта падмурак для нашых гімназістаў, калі яны атрыманыя ў выніку пошуку і даследаванняў. Неабходна ствараць для вучняў больш нестандартных сітуацый і ніколі не даваць гатовых ведаў. Галоўнае – не веданне саміх фактаў, а ўменне аналізаваць іх, параўноўваць, ацэньваць, уключаць вучняў у практыку маўленчых зносін на розных узроўнях сацыяльнага ўзаемадзеяння, прапаноўваць для аналізу бізнес-становішчы на беларускай мове.

Гімназія № 14 г. Мінска з 2016 па 2019 г. удзельнічала ў інавацыйным праекце па фарміраванні даследчых кампетэнцый вучняў. Аб’яднанне інтэлектуальных і духоўных сіл грамадства для захавання гісторыка-культурнай спадчыны, развіцця народных традыцый, выхавання ў грамадзян любові да Айчыны спрыяла падтрымцы творчых ініцыятыў па захаванні духоўнай і культурнай спадчыны нашага народа праз рэалізацыю маршрутаў шматузроўневага ўзаемадзеяння (гл. табліцу).

| Накірункі дзейнасці | Маршруты ўзаемадзеяння | Прагназуемы вынік |
|---|---|---|
| Інфармацыйна-аналітычная, плана-ва-прагнастычная, арганізацыйна-выканаўчая дзейнасць | 1. Вывучэнне спецыялізаванай вучэбна-метадычнай літаратуры.<br>2. Дыягностыка і анкетаванне ўзроўню маўленчых кампетэнцый суб’ектаў узаемазносін адукацыйнай прасторы гімназіі | 1. Стварэнне тэзаўруса ключавых паняццяў.<br>2. Распрацоўка макета электроннага рэсурсу «Маршрут шматузроўневага ўзаемадзеяння ў беларускамоўным адукацыйным асяроддзі».<br>3. Падбор і распрацоўка анкет, тэстаў, апытальнікаў |
| Матывацыйная і рэгуляцыйна-карэкцыйная дзейнасць | 1. Папаўненне новымі метадычнымі распрацоўкамі партфоліа класнага кіраўніка і настаўніка беларускай мовы і літаратуры.<br>2. Далучэнне вучняў да пошукавай, даследчай, праектнай, афарміцельскай працы праз выхаванне павагі да роднага слова, нацыянальнай гісторыі і культуры | 1. Забеспячэнне комплекснай метадычнай падтрымкі педагогаў па развіцці прафесійных кампетэнцый.<br>2. Стварэнне матываванага адукацыйнага асяроддзя, адаптаванага для асобаснага станаўлення вучня.<br>3. Апрабацыя рэсурсу «Маршрут шматузроўневага ўзаемадзеяння ў беларускамоўным адукацыйным асяроддзі» |
| Распаўсюджванне вопыту | 1. Стварэнне банка дадзеных па распаўсюджванні вопыту па ўкараненні маршрутаў шматузроўневага ўзаемадзеяння па фарміраванні і развіцці маўленчых кампетэнцый.<br>2. Распрацаваць механізм веернага сацыяльна значнага ўзаемадзеяння: вучань – сям’я – гімназія – сацыякультурныя ўстановы | 1. Абагульненне і распаўсюджванне вопыту па ўкараненні маршрутаў шматузроўневага ўзаемадзеяння па фарміраванні і развіцці маўленчых кампетэнцый.<br>2. Арганізацыя партнёрскага ўзаемадзеяння гімназіі з сацыякультурнымі аб’ектамі на ўзроўні раёна, горада, рэспублікі, міжнародных кантактаў |

2017 г. для нашага грамадства прайшоў пад эгідай Года навукі. Гэта спрыяла ўзмацненню навуковай складаючай праекта: быў зроблены акцэнт на фарміраванні даследчай кампетэнтнасці кожнага вучня ў рамках вучэбных заняткаў, што забяспечыла пасля атрыманне змястоўных дыдактычных і метадычных матэрыялаў як прадуктаў інавацыйнай дзейнасці.

Ідэя Года малой радзімы стала прыярытэтам для грамадскага жыцця нашай рэспублікі ў 2018 і 2019 гг., працягнецца да 2020 г., і, вядома, яна не магла не адбіцца на змесце інавацыйнай дзейнасці ў гімназіі. Гэта выявілася ў імкненні да больш глыбокага і сістэмнага вывучэння духоўнай і культурнай спадчыны малой радзімы і папулярызацыі вывучанага праз сацыяльна значныя праекты. Увасабленне гэтай ідэі не толькі пашырыла і ўзбагаціла працэсуальную і змястоўную дзейнасць педагогаў і вучняў, але і надало гарманічнае гучанне праекту ў адпаведнасці з каштоўнаснымі ўстаноўкамі грамадства.

Праблема развіцця маўлення вучняў заўсёды была актуальная. Маўленне дапамагае дзіцяці не толькі мець зносіны, але і пазнаваць свет. Для вучня добрае маўленне – заклад паспяховага навучання і развіцця, магчымасць у поўнай меры існаваць у грамадстве, пракладаць свае будучыя прафесійныя сцяжынкі.

Дадзены вопыт прадстаўляўся сярод педагогаў Заводскага раёна г. Мінска праз удзел у працы раённага метадычнага аб’яднання, правядзенне майстар-класу на VII і VIII Мінскім моладзевым фестывалі педагагічных ідэй і рашэнняў, рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах, фестывалях і конкурсах на ўзроўні МГІРА, АПА.

У бліжэйшай перспектыве вызначана стварэнне механізму веернага сацыяльна значнага ўзаемадзеяння (вучань – сям'я – гімназія – сацыякультурныя ўстановы), бізнес-каманды, арганізацыя партнёрскага ўзаемадзеяння на ўзроўні раёна, горада, рэспублікі, пашырэнне міжнародных кантактаў і правядзенне рэгіянальнага праекта «Я – беларус маленькі: ад школы да бізнесу адзін крок».

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Выготский, Л. С.* Собрание сочинений : в 6 т. / Л. С. Выготский. – М. : Педагогика, 1982. – 6 т.
2. *Гарбунова, М. Б.* Фарміраванне духоўна-маральнай культуры вучняў / М. Б. Гарбунова // Адукацыя і выхаванне. – 2008. – № 2. – С. 27–32.
3. *Зенченко, В. А.* Проблемы формирования гражданственности и патриотизма у современной молодежи / В. А. Зенченко. – Минск, 2001.
4. *Чепурных, Е. Е.* Инновационный проект развития образования. Учебное книгоиздание / Е. Е. Чепурных. – М. : Мир книг, 2001. – 143 с.
5. *Колесникова, И. А.* Педагогическое проектирование : учеб. пособие / И. А. Колесникова, М. П. Горчакова-Сибирская ; под ред. И. А. Колесниковой. – М. : Академия, 2005. – 288 с.
6. *Лукашенко, А. Г.* Сильная и процветающая Беларусь должна иметь прочный идеологический фундамент / А. Г. Лукашенко // Рэспубліка. – 2003. – 29 сак. – С. 1–8.
7. *Маркович, Е. П.* Воспитать человека – гражданина и патриота / Е. П. Маркович // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 4. – С. 30–34.
8. *Мянькоў, Ю. У.* Новае – майстэрня будучага / Ю. У. Мянькоў // Беларуская мова і літаратура. – 2011. – № 6. – С. 53–56.
9. *Новикова, Т. Г.* Теоретические подходы к технологии экспертизы инновационных проектов / Т. Г. Новикова // Школьные технологии. – 2002. – № 1.


УДК 378

**С. Н. Мизякина**

*Белорусский государственный аграрный технический университет,*
*Минск, Беларусь, mizyakina_sn@mail.ru*

# МЕСТО ЭСТЕТИКИ КАК УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ В СИСТЕМЕ БИЗНЕС-ОБРАЗОВАНИЯ

*Выявлены социокультурные и праксеологические основания преподавания учебной дисциплины «Эстетика» в рамках подготовки студентов экономических специальностей, обозначены основные цели и задачи курса, а также компетенции, которые должен приобрести студент в процессе изучения эстетики.*

***Ключевые слова:*** *эстетика в бизнес-образовании, эстетизация повседневности*

**S. Mizyakina**

*Belarusian State Agrarian Technical University, Minsk, Belarus, mizyakina_sn@mail.ru*

# THE PLACE OF AESTHETICS AS AN ACADEMIC DISCIPLINE IN A BUSINESS EDUCATION SYSTEM

*The article reveals the sociocultural and praxeological foundations of teaching the discipline «Aesthetics» in the framework of training students of economic specialties. The author outlines the main goals and*